## ДЗЕНЬ ДОБРЫ, НОВЫ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД! СА СВЯТАМ ВЕДАЎ ВАС, СЯБРЫ!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 13 (1006) | СУБОТА, 1 верасня 2001 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная





Таццяна Варанухіна з залатым медалём закончыла Кашырскую сярэднюю школу Рагачоўскага раёна. Яна паспяхова вытрымала экзамен па біялогіі і стала першакурсніцай біялагічнага факультэта.

Фота У.Чысціка.

**Рэктарат і грамадскія арганізацыі універсітэта горача віншуюць студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ імя Ф.Скарыны з пачаткам першага ў XXI стагоддзі новага навучальнага года і Днём ведаў. Выдатнай вучобы будучым маладым спецыялістам, плённай працы кожнаму, хто закліка볼 на высокім навукова-педагагічным узроўні забяспечваць навучальны працэс.**

**Асаблівыя пачуцці сёння выклікаюць першакурснікі. Права заняць месца ў вядучай ВНУ Беларускага Палесся яны заваявалі ў напружанай конкурснай барацьбе на уступных экзаменах.**

**Юнаму папаўненню універсітэта мы жадаем быць дастойнымі яго лепшых традыцый, якія неабходна працягваць і узбагачаць.**

**Мы упэўнены, што ў новым навучальным годзе ў летапіс універсітэта агульнымі намаганнямі будзе упісана чарговая яркая старонка.**

**РЭКТАРАТ. ПРАФКАМ. ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ.**

## У ВНУ НОВАГА ТЫПУ

Зроблены яшчэ адзін крок па стварэнню Саюзнага навукова-адукацыйнага цэнтра – Універсітэта інтэграцыі. Яго першымі студэнтамі сталі і 20 юнакоў і дзяўчат, закончыўшыя сярэднюю школу з медалямі і паступаўшыя на эканамічны, юрыдычны і матэматычны факультэты ГДУ. Першыя два гады яны будуць навучацца ў Маскоўскім дзяржаўным інстытуце электронікі і матэматыкі па спецыяльнасці "Нацыянальная эканоміка" са спецыялізацыяй "Эканоміка саюзнай дзяржавы".

**9 ВЕРАСНЯ — ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

## КОЖНЫ З НАС – У АДКАЗНАСЦІ ЗА БУДУЧЫНЮ

**М.В.СЕЛЬКІН, рэктар універсітэта, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член Савета Рэспублікі.**

Праз тыдзень нас чакае падзея гістарычнай важнасці: адбудуцца выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Яны будуць мець не толькі палітычнае, але, перш за ўсё, сацыяльна-эканамічнае значэнне. Менавіта ад кожнага з нас, нашага выбару залежыць, па якому шляху пойдзе ў далейшым наша незалежная, суверэнная дзяржава, якім стане жыццё кожнага жыхара рэспублікі. Як вядома, пры цяперашнім Прэзідэнце рабілася ўсё магчымае, каб яно няўхільна паляпшалася. Узраслі заробкі, пенсіі, стыпендыі, розныя матэрыяльныя дапамогі. Прымаліся ўсе меры для таго, каб не было затрымкі з іх выплатай.

Для кіраўніка Беларусі адным з галоўных стаў клопат аб найбольш адораных навучэнцах і студэнтах, іх педагогах. Гэта можна прасачыць і на прыкладзе нашага універсі-тэта. Лепшым студэнтам назначаліся прэзідэнцкія стыпендыі за высокія дасягненні ў вучэбнай і творчай дзейнасці, выдаваліся грашовыя прэміі. Прафесарам І.В.Максімею і А.А.Станкевіч за выдатныя вынікі ў навучальнай, метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці, у падрыхтоўцы маладых спецыялістаў былі ўстаноўлены персанальныя надбаўкі да заработнай платы.

Сёння нельга не нагадаць, што Прэзідэнт нашай краіны А.Р.Лукашэнка стаў ініцыятарам стварэння Саюза Беларусі і Расіі, далучэння да яго іншых рэспублік былога СССР і настойліва дамагаецца рэалізацыі пастаўленай мэты. Ён устанавіў цесныя ўзаемавыгадныя партнёрскія адносіны з многімі рэгіёнамі Расіі, дзяржавамі СНД і далёкага замежжа. Гэта знайшло высокую ацэнку з боку шырока вядомых дзяржаўных дзеячоў, палітолагаў, спецыялістаў розных галін народнай гаспадаркі, простых людзей.

Канешне, у нашай краіне ёсць яшчэ нямала праблем, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння і агульных намаганняў. Аднак гэта не павінна быць прадметам неабгрунтаванай крытыкі, якая накіравана ў адрас Прэзідэнта і яго каманды. Нельга смакаваць тыя недахопы, якія залежаць не толькі ад іх дзейнасці, а іменна на гэта накіравана крытыка апазіцыянераў рознага кшталту. За ўладу ў краіне разгарнулася надзвычай вострая барацьба. І пры сваім выбары дастойнага кіраўніка краіны мы павінны быць стрыманымі, разважлівымі і аб'ектыўнымі. Папулісцкія абяцанні некаторых кандыдатаў у Прэзідэнты, як кажуць, да дабра не прывядуць. На ўсе жыццёвыя рэчы трэба глядзець рэальна і не схіліцца на шлях правакацый і падману.

9 верасня ва ўстаноўлены час адчыняцца дзверы выбарчых участкаў, якія размясціліся ў вучэбных карпусах №1 і №2 нашага універсітэта. Іх выбарчыя камісіі зробяць усё магчымае, каб важнейшая дзяржаўная кампанія прайшла на самым высокім арганізацыйным узроўні і яе вынікі ні ў каго не выклікалі ні малейшых сумненняў.

Пачэсны грамадзянскі абавязак кожнага выкладчыка, супрацоўніка, аспіранта і студэнта нашага універсітэта ў дзень выбараў прыйсці на свае выбарчыя ўчасткі і аддаць свой голас за самага дастойнага кандыдата ў Прэзідэнты краіны, які здольны весці свой народ і сіняВокую Рэспубліку Беларусь па шляху да далейшага сацыяльна-эканамічнага ўздыму і дабрабыту людзей.

## НАВУКОВЫ ФОРУМ ФІЗІКАЎ



У жніўні на базе пансіяната ВБМА "Гомельпрамбуд" "Залатыя пяскі" сем дзён працавала шостая Міжнародная школа-семінар па праблемах фізікі часціц, адным з арганізатараў якой быў наш універсітэт. Трыццаць гадоў таму ў гэтым маляўнічым куточку Гомельшчыны пачынала сваю работу першая школа-семінар, ініцыятарам стварэння якой быў вядомы беларускі вучоны, акадэмік Ф.І.Фёдараў. Сёлетні навуковы форум прысвячаўся яго светлай памяці з нагоды 90-гадовага юбілею.

Віншаванне ўдзельнікам і гасцям Міжнароднай Гомельскай школы-семінара "Актуальныя праблемы фізікі часціц" даслаў прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь У.В.Ярмошын.

У адкрыцці гэтага важнага навуковага мерапрыемства прынялі ўдзел намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама У.У.Давідовіч і міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь В.І.Стражаў, які ў свой час быў адным з самых актыўных удзельнікаў гэтай школы-семінара.

У першы дзень работы школы-семінара перад яе ўдзельнікамі выступіў старшыня Савета рэктараў Гомель-шчыны, рэктар нашага універсітэта прафесар М.В.Селькін.

Навуковая праграма праведзенага мерапрыемства была насычана навуковымі лекцыямі, дакладамі па тэарэтычнай і эксперыментальнай фізіцы мікрасвету.

*(Больш падрабязна аб рабоце школы-семінара фізікаў будзе расказана ў наступным нумары нашай газеты.)*

## РАСТУЦЬ РАДЫ НАВУКОЎЦАЎ

Напрыканцы мінулага навучальнага года на спецыялізаваным савеце пры ГДУ па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый строгі экзамен трымалі асістэнт кафедры алгебры і геаметрыі В.В.Падгорная (навуковы кіраўнік – прафесар В.С.Манахаў), а таксама выпускніца матэматычнага факультэта і аспірантуры вышэйназванай кафедры Т.Р.Вішнеўская (навуковы кіраўнік – прафесар А.М.Скіба). Яны паспяхова справіліся з пастаўленай задачай і атрымалі права на прысуджэнне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

Узрастае навуковы патэнцыял і юрыдычнага факультэта. Дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата юрыдычных навук абараніў асістэнт кафедры грамадзянска-прававых дысцыплін Ю.Ц.Гульбін.

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага і юрыдычнага факультэтаў горача віншуюць названых выкладчыкаў і жадаюць ім плённай працы ў навукова-педагагічнай дзейнасці.*

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, асабісты ўклад у арганізацыю навучальна-выхаваўчага працэсу Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, дэкан завочнага факультэта нашага універсітэта ***МУРАШКА Міхаіл Нікадзімавіч*** узнагароджаны медалём "За працоўныя заслугі".

***

За шматгадовую добрасумленную працу, вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне эканомікі вобласці і ў сувязі з 80-годдзем утварэння эканамічных органаў краіны Ганаровай граматай абласнога Савета дэпутатаў узнагароджаны кандыдат эканамічных навук дацэнт, загадчык кафедры эканамічных тэорый нашага універсітэта ***САРВІРАЎ Барыс Уладзіміравіч***.

## ГАНАРОВЫЯ ГРАМАТЫ - ЮБІЛЯРАМ

60-годдзе з дня свайго нараджэння адзначыў старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту, даўні аўтар, пазаштатны спартыўны аглядальнік нашай газеты **В.З.МАРЧАНКА.** За шматгадовую плённую працу па падрыхтоўцы маладых кадраў, шырокае асвятленне ў СМІ фізкультурна-аздараўленчага і спартыўнага руху, праводзімых разнастайных спаборніцтваў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ён узнагароджаны Ганаровымі граматамі ГДУ імя Ф.Скарыны, абласнога ўпраўлення і гарадскога камітэта па фізічнай культуры, спорту і турызму.

З гэтай нагоды Віктара Захаравіча горача віншуе калектыў рэдакцыі "Гомельскага універсітэта", жадае яму моцнага здароўя і далейшых поспехаў у высакароднай дзейнасці.

***

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровымі граматамі універсітэта і гарадскога камітэта па фізічнай культуры, спорту і турызму ўзнагароджана старшы выкладчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту **ЧОБАТАВА Зінаіда Іванаўна.**

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

## БЕЛАРУСЬ АД ВЫБАРАЎ ДА ВЫБАРАЎ

• Рэспубліка Беларусь захавала першае месца сярод краін СНД па вытворчасці на душу насельніцтва мяса, малака, яек і практычна поўнасцю забяспечвае патрэбу насельніцтва ў гэтых прадуктах. За прайшоўшае дзесяцігоддзе былі ліквідаваны дэфіцыт тавараў і чэргі ў магазінах, задавальняецца попыт насельніцтва практычна на ўсе віды тавараў.

• Рэспубліка па будаўніцтву жылля ўстойліва займае адно з першых месцаў сярод краін СНД, Прыбалтыкі і Польшчы. За 1995-1999 гады на адну тысячу насельніцтва ў рэспубліцы ўведзена 1448 кв. м агульнай плошчы жылых дамоў, у Расіі — 1179 кв. м, Украіне — 693, Кыргызстане — 387, Казахстане — 445 кв. м. У 2000 г. на адну тысячу насельніцтва ў Беларусі ўведзена 353 кв. м агульнай плошчы жылых дамоў, у Расіі — 209 кв. м, Украіне — 113, Кыргызстане — 93, Казахстане — 82 кв. м.

• За гады, якія прайшлі пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, на ліквідацыю яе вынікаў накіравана 10761,1 млн. руб. (у супараўнальных цэнах 1991 г.). За кошт гэтых сродкаў пабудавана і набыта 52,8 тыс. кватэр агульнай плошчай 3,6 млн. кв. м, уведзены ў эксплуатацыю агульнаадукацыйныя школы на 39,4 тыс. вучнёўскіх месцаў, дашкольныя ўстановы на 13,9 тыс. месцаў, бальніцы на 3,9 тыс. коек, амбулаторна-паліклінічныя ўстановы на 17,7 тыс. наведванняў у змену. Пабудаваны вадаправодныя сеткі агульнай працягласцю 438 км і сеткі газіфікацыі працягам 1343 км.

• Пасля доўгага перыяду эканамічнага спаду, дэградацыі вытворчасці і фактычнага развалу ўнутранага рынку, выкліканага агульнавядомымі прычынамі, народнагаспадарчы комплекс г.Гомеля, прайшоўшы ў 1994-1995 г.г. фазу стабілізацыі, пачынаючы з 1996 г. уступіў у перыяд паступовага эканамічнага ўздыму.

У 2000 г. прамысловым комплексам горада выраблена прадукцыі на суму 292 млрд. руб., што на 82,8% больш, чым у 1996 г.

Выпуск тавараў народнага спажывання павялічыўся за гэты перыяд на 52% і склаў у 2000 г. 251,3 млрд. руб.

Значна ўзрос экспартны патэнцыял прадпрыемстваў і арганізацый Гомеля. У 2000г. больш за 480 прадпрыемстваў і арганізацый горада ажыццяўлялі экспартныя пастаўкі ў 30 краін свету.

• У XXI стагоддзе краіна ўступіла з дастаткова высокім узроўнем адукацыі. Па колькасці студэнтаў Беларусь займае адно з самых высокіх месцаў сярод дзяржаў СНД. На 10 тыс. насельніцтва прыходзіцца 282 студэнты ВНУ, а індэкс узроўню адукацыі дасягнуў 0,927, узровень пісьменнасці дарослага насельніцтва склаў 99,6%.

• На пачатак 2000-2001 навучальнага года ў рэспубліцы працавалі 57 вышэйшых навучальных устаноў, з іх 25 універсітэтаў і 9 акадэмій. У ВНУ навучаліся 282 тыс. студэнтаў, з іх 171 тыс. — на дзённай форме навучання, 109 тыс. — на завочнай. У параўнанні з 1990-1991 навучальным годам колькасць студэнтаў узрасла на 93 тыс. (на 49%), на дзённым навучанні — на 55 тыс. (на 47%), на завочным — на 42 тыс. (на 63%).

• На пачатак 2000-2001 навучальнага года ў дзяржаўных ВНУ рэспублікі навучалася за кошт сродкаў бюджэту 156 тыс. студэнтаў, за кошт уласных сродкаў — 72 тыс.

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ
БЕЛАРУСЬ АД ВЫБАРАЎ ДА ВЫБАРАЎ

і за кошт сродкаў прадпрыемстваў і арганізацый — 17 тыс. студэнтаў, у 1996-1997 навучальным годзе — адпаведна 150 тыс., 22 тыс. і 8 тыс. студэнтаў.

• У сувязі з прадстаўленнем першага рабочага месца выпускнікам дзяржаўных вышэйшых, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў іх доля сярод беспрацоўных знізілася з 7,3% на канец 1995 года да 3,2% на канец 2000 года.

• Рэспубліка Беларусь заўсёды адрознівалася высокім адукацыйным узроўнем працуючых. У 1995 г. на тысячу працуючых прыходзілася 160 работнікаў з вышэйшай і 204 з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, у 2000 г. адпаведна 188 і 224 чалавекі.

• Пашырыліся і ўмацаваліся сувязі ў розных галінах навукі паміж калектывамі навукова-даследчых інстытутаў і ВНУ г.Гомеля з іх замежнымі партнёрамі. У 2000г. Гомельскім дзяржуніверсітэтам імя Ф.Скарыны, Гомельскім кааператыўным інстытутам і Беларускім дзяржаўным універсітэтам транспарту было падпісана 7 дагавораў аб супрацоўніцтве з навуковымі і вучэбнымі цэнтрамі ЗША, Кітая, Фінляндыі, Швецыі, Расіі.

• На працягу мінулага года студэнты і вучоныя г.Гомеля прайшлі стажыроўку і азнаёміліся з навуковымі дасягненнямі Францыі, Германіі, Велікабрытаніі, ЗША, Італіі, Кітая, Ізраіля.

• У лістападзе 1998 г. Гомельскім гарвыканкамам была зацверджана гарадская праграма развіцця адукацыі, асноўнай мэтай якой з'яўляецца павышэнне якасці навучання школьнікаў, з максімальна магчымым улікам іх схільнасцей да той або іншай галіны ведаў і інтэлектуальных здольнасцей.

У 1996 г. СШ №36 была пераўтворана ў гарадскую беларуска-славянскую гімназію імя І.Мележа.

У 1998 г. СШ №18 была рэарганізавана ў Ірынінскую гімназію, а СШ №№8 і 56 быў прысвоены статус "Школы з ліцэйскімі класамі пры Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны", СШ №58 — "Сярэдняя агульнаадукацыйная школа імя Ф.П.Гааза з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы, музычна-харавым, мастацкім ухілам", СШ № 41 — "Сярэдняя агульнаадукацыйная школа з агульнаэстэтычным ухілам".

• Ахова здароўя заўсёды была і застаецца адным з важнейшых прыярытэтных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця г.Гомеля. Нягледзячы на эканамічныя праблемы, адшукваюцца магчымасці мэтавага фінансавання для захавання і развіцця матэрыяльнай базы ўстаноў аховы здароўя, набыцця медыкаментаў і медыцынскага абсталявання. У лячэбных установах горада ўкаранёна звыш 60 новых методык і тэхналогій, паспяхова развіваецца міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне аховы здароўя па лячэнню хворых з рознымі паталогіямі. Лячэбнымі ўстановамі горада было атрымана медыкаментаў, дапаможных медыцынскіх сродкаў па лініі гуманітарнай дапамогі з Германіі на суму каля 5267 тыс. марак.

• За прайшоўшае пяцігоддзе ў г.Гомелі былі ўведзены ў эксплуатацыю конна-спартыўны манеж, зала гульнёвых відаў спорту па вул. Першамайскай, Лядовы палац, чатыры плавальныя басейны, 12 спартыўных залаў.

*(Па статыстычных дадзеных.)*



## ПАТРЫЯРХ МАСКОЎСКІ І ЎСЕЯ РУСІ АЛЕКСІЙ II – ГАНАРОВЫ ДОКТАР НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА

У першай дэкадзе ліпеня Гомельшчыну наведаў Патрыярх Маскоўскі і ўсея Русі Алексій II. Паўсюдна — ля сівых камянёў Тураўскага замчышча, ля помніка ахвярам катастрофы на ЧАЭС у Мазыры, пад гожымі скляпеннямі Гомельскага Свята-Петрапаўлаўскага сабора, каля велічнага сімвалу славянскага яднання — манумента Дружбы на мяжы Беларусі, Расіі і Украіны — Вярхоўнага Архіпастыра нязменна сустракалі адкрытасць, шчырасць, дабрыня і ўласцівая нашым людзям гасціннасць.

Высокі госць удзяляе велізарную ўвагу вяртанню да хрысціянскіх каштоўнасцяў, выхаванню, у тым ліку і ў асяроддзі моладзі, устойлівай маральнасці. Шмат карысці прыносіць і яго вялікая навуковая дзейнасць на ніве багаслоўства. Улічваючы гэта, вучоны Савет нашага універсітэта прыняў рашэнне аб прысваенні Алексію II звання Ганаровага доктара ГДУ імя Ф.Скарыны.

Па даручэнню Савета прыемную місію ўручэння кіраўніку Рускай Праваслаўнай царквы дыплома Ганаровага доктара адной з вядучых ВНУ нашай краіны выканаў у час сустрэчы з Яго Свяцейшаствам рэктар універсітэта доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь М.В.Селькін.

Пасля адбыцця Алексія II з Гомеля ўрадавая пошта прынесла члену Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу пасланне Яго Свяцейшаства. Алексій II выказаў удзячнасць вучонаму Савету універсітэта за аказаны яму высокі гонар — быць удастоеным ганаровага звання. Аўтар паслання падкрэсліў, што ён успрыняў гэты факт не толькі як асабістую ўзнагароду, а перш за ўсё як прызнанне заслуг Праваслаўнай Царквы ў справе яднання брацкіх славянскіх народаў, якія на працягу стагоддзяў захавалі вернасць гістарычным, духоўным і культурным традыцыям.

Адзначыўшы вялікую і ўсебаковую дзейнасць калектыву універсітэта па духоўнаму выхаванню падрастаючага пакалення, якому ў новым XXI стагоддзі давядзецца працаваць на дабрабыт Саюза Беларусі і Расіі, Найсвяцейшы Патрыярх пажадаў прафесарска-выкладчыцкаму саставу, супрацоўнікам і студэнтам благаславенных поспехаў у справе адукацыі і асветы.

НА ЗДЫМКУ: рэктар ГДУ М.В.Селькін уручае Патрыярху Маскоўскаму і ўсея Русі Алексію II дыплом і знак Ганаровага доктара універсітэта.

## ДОЛЖНОСТНЫЕ ОКЛАДЫ ПРОФЕССОРСКО-ПРЕПОДАВАТЕЛЬСКОГО СОСТАВА ГГУ им. Ф.Скорины с 1 июля 2001 года

| Наименование должностей | Исходный оклад | Повыш. тар. став. за стаж, % | Повыш. тар. став. за стаж, сумма | Должностной оклад |
|---|---|---|---|---|
| **Заведующий кафедрой** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15 лет | 86 710 р. | 30% | 26 013 р. | 112 723 р. |
| имеющ. стаж свыше 10 лет | 86 710 р. | 20% | 17 342 р. | 104 052 р. |
| имеющ. стаж свыше 5 лет | 86 710 р. | 15% | 13 007 р. | 99 717 р. |
| имеющ. стаж до 5 лет | 86 710 р. | 10% | 8 671 р. | 95 381 р. |
| **Профессор** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15 лет | 81 055 р. | 30% | 24 317 р. | 105 372 р. |
| имеющ. стаж свыше 10 лет | 81 055 р. | 20% | 16 211 р. | 97 266 р. |
| имеющ. стаж свыше 5 лет | 81 055 р. | 15% | 12 158 р. | 93 213 р. |
| имеющ. стаж до 5 лет | 81 055 р. | 10% | 8 106 р. | 89 161 р. |
| **Доцент** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15 лет | 70 760 р. | 30% | 21 228 р. | 91 988 р. |
| имеющ. стаж свыше 10 лет | 70 760 р. | 20% | 14 152 р. | 84 912 р. |
| имеющ. стаж свыше 5 лет | 70 760 р. | 15% | 10 614 р. | 81 374 р. |
| имеющ. стаж до 5 лет | 70 760 р. | 10% | 7 076 р. | 77 836 р. |
| **Старший преподаватель** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15 лет | 66 120 р. | 30% | 19 836 р. | 85 956 р. |
| имеющ. стаж свыше 10 лет | 66 120 р. | 20% | 13 224 р. | 79 344 р. |
| имеющ. стаж свыше 5 лет | 66 120 р. | 15% | 9 918 р. | 76 038 р. |
| имеющ. стаж до 5 лет | 66 120 р. | 10% | 6 612 р. | 72 732 р. |
| **Ассистент, преподаватель** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15 лет | 61 770 р. | 30% | 18 531 р. | 80 301 р. |
| имеющ. стаж свыше 10 лет | 61 770 р. | 20% | 12 354 р. | 74 124 р. |
| имеющ. стаж свыше 5 лет | 61 770 р. | 15% | 9 266 р. | 71 036 р. |
| имеющ. стаж до 5 лет | 61 770 р. | 10% | 6 177 р. | 67 947 р. |

Доплата за ученую степень доктора наук (6 мин. з/пл.) 45000 руб. в месяц
Доплата за ученую степень кандидата наук (3 мин. з/пл) 22500 руб. в месяц
Доплата за и.о. декана (70% от ст.1 разряда) 10150 руб. в месяц
Доплата за и.о. зам. декана (65% от ст. 1 разряда) 9425 руб. в месяц

## УЗРОС БЮДЖЭТ СТУДЭНТАЎ

Як паведамлялася ў рэспубліканскіх СМІ, з ліпеня бягучага года сярэдні памер студэнцкіх стыпендый павялічыўся на 25%. Аднак тая сума грошай, якую яны будуць атрымоўваць, яшчэ далёкая ад спажывецкага кошыка.

# ПЕРШАПРАХОДЦЫ НОВАГА СТАГОДДЗЯ

## Да вынікаў уступных экзаменаў – 2001 у ГДУ

Бясспрэчна, самым адметным, памятным і прыемным для сёлетніх першакурснікаў стане тое, што яны пераступілі парогі ВНУ напачатку новага веку і тысячагоддзя. Дасягнуць такога права было нялёгка. Давялося вытрымаць сапраўды знясільваючае выпрабаванне на глыбіню ведаў, трываласць нерваў, прадэманстраваць упэўненасць у свае сілы.

У цэлым па Беларусі конкурс абітурыентаў сёлета быў самым высокім за апошнія 20 гадоў. Узрос ён і ў нашым універсітэце. На кожнае бюджэтнае месца прэтэндавала 2,85 чалавека (летась — 2,47).

Прыток паступаючых тлумачыцца дзвюма прычынамі. Па-першае, сёлета прыкметна павялічылася колькасць выпускнікоў агульнаадукацыйных школ. А па-другое, абітурыентам упершыню дазвалялася пашукаць сваё шчасце паралельна не ў адной, як раней, а і ў іншых вышэйшых навучальных установах.

Неабходна зазначыць, што сёлета прыём першакурснікаў на бюджэтныя месцы ў нашым універсітэце знізіўся з 1000 да 980 чалавек. Конкурс застаўся стабільным на ўсе спецыяльнасці. Праўда, амаль на адну трэць іх ён у параўнанні з леташнім нязначна зменшыўся. А вось на такія спецыяльнасці, як "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі", "Прыкладная матэматыка", "Фізіка (вытворчае аддзяленне)", "Фізіка і тэхнічная творчасць", "Сусветная эканоміка", "Геалогія і разведка карысных выкапняў", "Фізічная электроніка" значна ўзрос.

Як і ў папярэднім годзе, пры паступленні на спецыяльнасці "Матэматыка", "Фізіка", "Фізіка з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць", "Фізічная электроніка", "Геалогія і разведка карысных выкапняў", "Біялогія" асобы, якія закончылі сярэднія агульнаадукацыйныя навучальныя ўстановы з медалём і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы або ПТВ (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай, здавалі першы ўступны экзамен па прафілюючай дысцыпліне і пры атрыманні адзнак "5" або "4,5" залічваліся ў склад першакурснікаў.

Выпускнікі дзесяці раёнаў Гомельшчыны, якія найбольш пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы, пры наяўнасці залатога або сярэбранага медалёў пры паступленні на педагагічныя спецыяльнасці на ўмовах мэтавага прыёму, праходзілі субяседаванне да пачатку асноўных уступных экзаменаў. Паспяхова вытрымаўшы яго, таксама атрымалі права на залічэнне ва універсітэт.

Неабходна звярнуць увагу на высокі прахадны бал на педагагічнае аддзяленне фізічнага факультэта. Такі атрымаўся — 9,5 бала — у выніку паспяховага выкарыстання льгот, устаноўленых для медалістаў, паступаючых на гэтую спецыяльнасць.

Больш падрабязна з конкурсам сёлетняга года ў параўнанні з папярэднім, а таксама з прахаднымі баламі адпаведна нашы чытачы могуць пазнаёміцца па прыведзеных у табліцы дадзеных.

| № п/п | Назва спецыяльнасці | Конкурс | | Агульны прахадны бал | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | 2001 г. | 2000 г. | 2001 г. | 2000 г. |
| 1 | Матэматыка | 2,54 | 1,68 | 8 з 10 | 7,5 |
| 2 | Прыкладная матэматыка (вытв.-пед.) | 2,80 | 2,92 | 8 з 10 | 8,5 |
| 3 | Фізіка (педагагічнае аддзяленне) | 2,00 | 1,32 | 9,5 з 10 | 6,5 |
| 4 | Фізіка (вытворчае аддзяленне) | 2,68 | 1,56 | 7,5 з 10 | 7,0 |
| 5 | Фізіка і тэхнічная творчасць | 2,50 | 1,52 | 7,5 з 10 | 6,5 |
| 6 | Аўтаматызаваныя сіст. апрац. інфармацыі | 4,20 | 2,80 | 15 з 20 | |
| 7 | Руская мова і літаратура | 2,76 | 2,46 | 13 з 15 | 13,0 |
| 8 | Экалогія | 3,92 | 3,60 | 8 з 10 | 8,5 |
| 9 | Руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура | 2,12 | 2,56 | 11,5 з 15 | 13,5 |
| 10 | Беларуская мова і літаратура | 3,68 | 3,88 | 12,5 з 15 | 13,0 |
| 11 | Беларуская мова і літаратура і англійская мова | 2,20 | 2,12 | 12,5 з 15 | 12,5 |
| 12 | Англійская мова | 2,80 | 2,24 | 14 з 15 | |
| 13 | Нямецкая мова | 2,56 | 2,28 | 12 з 15 | |
| 14 | Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт | 3,44 | 3,72 | 8 з 10 | 8,0 |
| 15 | Прыкладная матэматыка (вытв. аддз.) | 4,00 | 2,92 | 8 з 10 | 8,5 |
| 16 | Эканоміка і кіраванне на вытворчасці | 3,52 | 4,20 | 8 з 10 | 8,0 |
| 17 | Гісторыя | 2,22 | 2,12 | 7,5 з 10 | 8,0 |
| 18 | Гісторыя і англійская мова | 2,08 | 1,92 | 8,5 з 10 | 9,0 |
| 19 | Сусветная эканоміка | 3,36 | 2,20 | 8,5 з 10 | 7,5 |
| 20 | Правазнаўства | 2,52 | 2,15 | 12,5 з 15 | 12,5 |
| 21 | Біялогія | 3,19 | 2,31 | 8,5 з 10 | 9,0 |
| 22 | Геалогія і разведка карысных выкапняў. | 3,32 | 1,92 | 8 з 10 | 7,0 |
| 23 | Геаграфія | 2,52 | 2,88 | 7 з 10 | 8,5 |
| 24 | Беларуская мова і літаратура, работа ў газетах і часопісах | 2,68 | 2,0 | 10,5 з 15 | |
| 25 | Фізічная культура і спорт | 2,59 | 2,83 | 8,5 з 10 | 9,0 |
| 26 | Фізічная электроніка | 3,08 | 1,72 | 8, з 10 | 8,0 |
| 27 | Камерцыйная дзейнасць | 3,36 | 3,40 | 6,5 з 10 | 7,5 |
| 28 | Псіхалогія | 3,92 | 3,88 | 7,5 з 10 | 9,0 |
| 29 | Фінансы і крэдыт | 3,16 | 3,96 | 8,5 з 10 | 8,5 |

Заўвага: сёлета экзамены на спецыяльнасць "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" праводзіліся па 10-бальнай сістэме. Таму нельга параўнаць прахадны бал з мінулагоднім. Адначасова зазначым, што для выпускнікоў сельскіх школ ён раўняўся 16.

Адсутнічае параўнанне з леташнімі прахаднымі баламі па спецыяльнасцях: "Англійская мова", "Нямецкая мова", "Беларуская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Літаратурная работа ў газетах і часопісах", паколькі на іх здавалася па чатыры заліковыя экзамены.

Для выпускнікоў сельскіх школ на спецыяльнасць "Фінансы і крэдыт" прахаднымі сёлета былі 8 балаў.



Дыктант пішуць абітурыенты філалагічнага факультэта.



Экзамен па геаграфіі Таццяна Машэчка (на здымку) вытрымала на "выдатна". 4,5 бала яна атрымала і за першы конкурсны экзамен. Гэты поспех забяспечыў ёй месца сярод першакурснікаў геолага-геаграфічнага факультэта.

## ВЫШЫНІ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ ПЛАНКІ

У бягучым годзе ў прыёмную камісію ГДУ ад абітурыентаў паступіла 2827 заяў — 2349 ад выпускнікоў гарадскіх школ і 478 — сельскіх. Сярод здаваўшых уступныя экзамены паспяхова вытрымалі іх 54,7% — на 12,5% менш, чым летась. Зазначым, што ў мінулым годзе на сямі спецыяльнасцях узровень паспяховасці перавышаў 80%. Сёлета экзаменацыйная планка апусцілася прыкметна ніжэй. Самага высокага паказчыка дасягнулі абітурыенты спецыяльнасці "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі". 78,4% яе абітурыентаў паспяхова вытрымалі ўступныя экзамены. Заўважым, што яшчэ зусім нядаўна гэта спецыяльнасць амаль не вызначалася сваёй прэстыжнасцю. Яна не прывабліваля і медалістаў. А на гэты раз конкурс на яе аказаўся самым высокім ва універсітэце. Да таго ж на 25 бюджэтных месцаў прэтэндавала 23 медалісты. Але толькі 6 з іх дасягнулі пастаўленай мэты.

72% склала паспяховасць абітурыентаў спецыяльнасці "Гісторыя і англійская мова". Яшчэ па васьмі спецыяльнасцях узровень паспяховасці перавысіў 60%.

Разам з тым трэба сказаць, што пры паступленні некаторыя абітурыенты засведчылі вельмі слабую падрыхтаванасць. Так, на спецыяльнасць "Псіхалогія" з 93 чалавек экзамены вытрымалі 25 — роўна столькі, колькі прадугледжвалася планавым наборам на бюджэтныя месцы. Пасля экзаменацыйных выпрабаванняў толькі адзін абітурыент аказаўся лішнім на спецыяльнасць "Камерцыйная дзейнасць", два — на спецыяльнасць "Прыкладная матэматыка" (вытворча-педагагічны паток). Не дасягнуў і 1/3 паказчык па паспяховасці ўступных экзаменаў на спецыяльнасць "Экалогія".

Большасць прынятых ва універсітэт па мэтаваму набору — выпускнікі сельскіх школ. Аднак якасць і глыбіня іх ведаў жадае быць значна лепшай. Не выпадкова колькасць прынятых першакурснікаў з сельскай мясцовасці, у параўнанні з леташнім, сёлета зменшылася на 3,2%, а гарадскіх на столькі ж узрасла.

Для цікаўных

## КОНКУРС У ВНУ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Сёлета самым высокім ён быў у Гомельскім медыцынскім інстытуце. На кожнае бюджэтнае месца прэтэндавала 4,27 абітурыента. Вельмі складаным быў адбор у Гомельскае вышэйшае інжынерна-каманднае вучылішча МНС. Каб стаць яго курсантамі, за кожнае месца змагалася па 3,7 чалавека. Прыкметна сёлета ўзрос конкурс і дасягнуў адзнакі 3,34 у Беларускі дзяржаўны універсітэт транспарту. Тое ж самае можна сказаць і пра Гомельскі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт імя П.О.Сухога, дзе конкурс склаў 3,14.

Па колькасці набору першакурснікаў наш універсітэт значна апярэджвае ўсе ВНУ Гомельшчыны. Сёлетні конкурс на яго факультэты склаў 2,88. Па гэтаму паказчыку не на многа адстаў Мазырскі дзяржаўны педінстытут імя Н.К.Крупскай — 2,62.

Як і ў папярэднія гады, у Гомельскі кааператыўны інстытут прыём студэнтаў ажыццяўляўся на дагаворнай аснове з арганізацыямі спажывецкай кааперацыі. Таму і конкурс тут быў адносна невысокім: 1,24.



Гамяльчанін Міхаіл Шумскі закончыў СШ №7, дзе вучыўся ў класе з фізіка-матэматычным ухілам. Трывалыя веды дазволілі яму паспяхова вытрымаць уступныя экзамены на фізічны факультэт, дзе будзе набываць вышэйшую адукацыю па фізічнай электроніцы.

## ДЭВАЛЬВАЦЫЯ ШКОЛЬНЫХ МЕДАЛЁЎ

Даўно стала ісцінай, што колькасць штогод выдаваемых выпускнікам школ залатых і сярэбраных медалёў за выдатную вучобу яўна перавышае ўзровень ведаў многіх такіх абітурыентаў. Пацвярджэннем гэтаму сталі вынікі сёлетніх уступных экзаменаў. Прычым яны атрымалі больш грунтоўны аналіз, каб у будучым асобныя школы і настаўнікі не дапускалі празмернай шчодрасці ў вызначэнні паспяховасці сваіх выхаванцаў.

На гэты раз у наш універсітэт паступала 560 медалістаў — усяго на 6 больш, чым у мінулым годзе. Аднак цяпер першакурснікамі сталі 270 з іх пры леташніх 345. Пацвердзілі вартасць сваіх медалёў толькі 116 абітурыентаў — крыху больш, чым кожны пяты. І амаль столькі ж — 107 — атрымалі нездавальняючыя адзнакі, што не можа не выклікаць непаразуменне і занепакоенасць школьнай падрыхтаванасцю і той безадказнасцю, з якой выдаюцца залатыя і сярэбраныя медалі.

У нейкай ступені можна пагадзіцца, што на ўступных экзаменах даволі складанымі былі заданні па пісьмовай матэматыцы. Можа таму са 118 медалістаў, якія паступалі на пяць спецыяльнасцей эканамічнага факультэта, толькі трое пацвердзілі свае выдатныя веды. А вось 45 "правалаў" сярод іх — лічба трывожная.

Дарэчы, пісьмовы экзамен па матэматыцы ў вядучай ВНУ нашай краіны — Беларускім дзяржаўным універсітэце, дзе сёлета ён ацэньваўся па 10-бальнай сістэме, вышэйшы бал атрымаў толькі адзін абітурыент. Аб гэтым паведамлялася на старонках газеты "Аргументы и факты в Белоруссии" (№ 32, 2001 г.).

Калі на матэматыцы медалісты "спатыкаюцца" пры паступленні ў многія ВНУ, дык атрымоўваць ім двойкі па іншых дысцыплінах проста недаравальна. У прыватнасці, з 66 медалістаў, якія марылі стаць біёлагамі, дасягнулі пастаўленай мэты толькі 25, 10 — атрымалі двойкі, а 27 не прайшлі па конкурсу.

Асобныя медалісты не вытрымалі ўступных экзаменаў, а некаторыя не прайшлі па конкурсу пры паступленні на педагагічныя і іншыя гуманітарныя спецыяльнасці.

Не вызначыліся глыбінёй ведаў і тыя, хто па заканчэнні сярэдніх спецыяльных устаноў атрымаў дыпломы з адзнакай. З 19 такіх абітурыентаў здолелі паступіць у ГДУ ўсяго двое.

Сярод нашых першакурснікаў:

— 801 выпускнік гарадскіх школ і 179 — сельскіх.

— 288 абітурыентаў залічана па мэтаваму набору.

— 12 чалавек з'яўляюцца пераможцамі алімпіяд.

— 62 — скончылі ліцэі і гімназіі.

— 53 — прайшлі даўніверсітэцкую падрыхтоўку.

— 10 — жыхары іншых краін СНД.

— звыш 200 чалавек прынята на вучобу ў ГДУ на платнай аснове.

Матэрыял з уступных экзаменаў па дадзеных прыёмнай камісіі да друку падрыхтаваў Ул.БАЛОГА.

Фота Ул.Чысціка.

*Для здароўя студэнтаў*

# НЕ ЧАКАЦЬ, А ДЗЕЙНІЧАЦЬ

Менавіта такія словы, вынесеныя ў загаловак, абраў дэвізам у сваёй рабоце галоўны ўрач санаторыя-прафілакторыя нашага універсітэта А.М.Сабалеўскі. На гэтай пасадзе Аляксандр Міхайлавіч працуе крыху больш за паўгода, а зрухі ў лепшы бок у матэрыяльным аснашчэнні, забеспячэнні лячэбнага працэсу студэнцкай здраўніцы ўжо даволі прыкметныя.

Недастатковае дзяржаўнае фінансаванне санаторыя-прафілакторыя не дазваляла апошнім часам развіваць яго базу. А неабходнасць у гэтым ужо наспела. Так, па словах А.М.Сабалеўскага, трэба пашырыць медыцынскія паслугі студэнтам у масажным кабінеце, інгаляторыі, адкрыць клініка-дыягнастычную лабараторыю, кабінет функцыянальнай дыягностыкі. Выйсце з сітуацыі ён бачыць у актыўным пошуку спонсараў – дабрачынных арганізацый, аб'яднанняў, якія аказваюць гуманітарную дапамогу насельніцтву Гомельшчыны, якое пацярпела ад аварыі на ЧАЭС. Улічваючы тое, што сярод студэнтаў ГДУ нямала юнакоў і дзяўчат з радыяцыйных раёнаў, і што ўжо праз два гады ў нашу ВНУ будуць паступаць на вучобу дзеці, якія нарадзіліся ў трагічным 1986-м годзе, увага да аздараўленчай установы нашага універсітэта, якая з'яўляецца адзінай такога тыпу на Гомельшчыне, павінна быць асаблівай. Таму і разаслаў Аляксандр Міхайлавіч пісьмы ў розныя дабрачынныя арганізацыі з просьбамі аб дапамозе.

І ўжо ёсць канкрэтныя вынікі. Дзякуючы арганізацыі "Сябры дзяцей Чарнобыля" з нямецкага горада Штутгарта, міжнароднаму грамадскаму аб'яднанню "Дапамога дзецям Чарнобыля", якое ўзначальвае Г.В.Карэцкі, Гомельскаму абласному маладзёжнаму фонду на чале з Л.М.Багданавай атрымана харчаванне для дзяцей студэнцкіх сем'яў, прадукты (сухое малако, макароны, рыс, цукар, алей) для сталовай прафілакторыя, вітаміны, лекавыя чаі, медыцынскі інструментарый і абсталяванне, разнастайная мэбля для жылых пакояў, кабінетаў і інш.

Летам Гомельшчыну наведвалі прадстаўнікі адной з дабрачынных арганізацый Германіі, якія пастаўляюць гуманітарную дапамогу ў нашу вобласць. Аляксандр Міхайлавіч запрасіў іх у санаторый-прафілакторый, каб яны змаглі на ўласныя вочы паглядзець, у чым мае патрэбу універсітэцкая лячэбная установа, і па меры магчымасці аказаць дапамогу. Замежныя госці яе абяцалі.

У народзе кажуць: "Адчыняюць дзверы таму, хто ў іх стукаецца". Так вобразна можна было б ахарактарызаваць тую вялікую работу, якую вядзе А.М.Сабалеўскі са сваім калектывам па наладжванню ў санаторыі-прафілакторыі належных умоў для аздараўлення і лячэння студэнцкай моладзі.

**Т.ДУБЯК.**

## АДКРЫТА ПАДПІСКА НА УНІВЕРСІТЭЦКУЮ ГАЗЕТУ

З 1 верасня адкрыта падпіска на газету "Гомельскі універсітэт" на 2001-2002 навучальны год. Кошт аднаго экземпляра – 1000 руб. Студэнты выпісваюць адзін экземпляр газеты на чатырох чалавек. Сабраныя на падпіску газеты грошы для здачы ва універсітэцкую касу папярэдне здаваць старастам акадэмічных груп, адказным за яе правядзенне на кафедрах і факультэтах.

Квіткі аб уплачаных за падпіску на газету грошах прад'яуляць яе рэдакцыі.

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

### аб'яўляе прыём у аспірантуру ў 2001 годзе

**з адрывам ад вытворчасці** *па спецыяльнасцях:*

дыферэнцыяльныя ўраўненні; матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лічбаў; механіка дэфармуемага цвёрдага цела; оптыка; фізіялогія; тэлекамунікацыйныя сістэмы і камп'ютэрныя сеткі; матэматычнае мадэліраванне, лічбавыя метады і комплексы праграм; эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; фінансы, грашовы абарот і крэдыт; бухгалтарскі ўлік, статыстыка; руская літаратура; беларуская мова; руская мова; канстытуцыйнае права, муніцыпальнае права; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае ўласнае права; крымінальны працэс, крыміналістыка і судовая эспертыза, аператыўна-вышуковая дзейнасць; агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі; тэорыя і методыка навучання і выхавання (англійская мова); тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі, аздараўленчай і адаптыўнай фізічнай культуры; педагагічная псіхалогія; геафізіка, геафізічныя метады пошукаў карысных выкапняў; фізічная геаграфія і біягеаграфія глеб і геахімія ландшафтаў.

**без адрыву ад вытворчасці:**

экалогія, тэлекамунікацыйныя сістэмы і камп'ютэрныя сеткі; матэматычнае мадэліраванне, лічбавыя метады і комплексы праграм; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; бухгалтарскі ўлік, статыстыка; руская мова; тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; гісторыя прававых вучэнняў; працоўнае права, права сацыяльнага забеспячэння; крымінальнае права і крыміналогія, крымінальна-выканаўчае права; тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі і аздараўленчай фізічнай культуры.

Паступаючыя ў аспірантуру здаюць конкурсныя ўступныя экзамены па філасофіі, замежнай мове і спецыяльнай дысцыпліне ў аб'ёме дзеючай праграмы для ВНУ.

Тэрмін навучання ў аспірантуры з адрывам ад вытворчасці — 3 гады, без адрыву ад вытворчасці — 4 гады. У аспірантуру прымаюцца асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю і здольнасць да навуковых даследаванняў. Да ўступных экзаменаў у аспірантуру прыёмнымі камісіямі дапускаюцца асобы, якія маюць вопыт практычнай работы (у тым ліку апублікаваныя работы), і выпускнікі ВНУ па рэкамендацыях саветаў ВНУ(факультэтаў) пры ўмове **высокага ўзроўню акадэмічнай падрыхтоўкі.**

Прыём і навучанне ў аспірантуры для фізічных асобаў, а таксама ведамстваў (арганізацый), якія не адносяцца да Міністэрства адукацыі, здзяйсняецца на аснове дагавораў або кантрактаў паміж фізічнай асобай, ведамствам (арганізацыяй) і ГДУ. Навучанне ў аспірантуры замежных грамадзян рэгулюецца міждзяржаўнымі дамоўленасцямі, дагаворамі з арганізацыямі або кантрактамі паміж замежнымі грамадзянамі і ГДУ.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру, падаюць заяву на імя рэктара ГДУ і прыкладваюць наступныя дакументы:

— асабісты лісток па ўліку кадраў, аўтабіяграфію і тры фотакарткі памерам 4x6;

— спіс і копіі апублікаваных навуковых работ, вынаходніцтваў, патэнтаў і спіс справаздач аб выкананых даследаваннях і распрацоўках; асобы, якія не маюць апублікаваных навуковых работ, вынаходніцтваў і патэнтаў, прадстаўляюць навуковыя даклады (рэфераты) па выбранай тэме ў адпаведнасці са спецыяльнасцю;

— выпіску з пратакола пасяджэння савета (факультэта) вышэйшай навучальнай установы для асоб, рэкамендаваных у аспірантуру непасрэдна пасля заканчэння вышэйшых навучальных устаноў;

— копіі дыплома аб вышэйшай адукацыі і выпіску з заліковай ведамасці (дадатак да дыплома);

— выпіску з працоўнай кніжкі;

— копіі дакументаў аб здачы кандыдацкіх экзаменаў (пры наяўнасці ў паступаючых у аспірантуру здадзеных кандыдацкіх экзаменаў);

— пашпарт, дыплом аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы і дакументы аб здачы кандыдацкіх экзаменаў прад'яўляюцца асабіста.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру па накіраванню ведамстваў (арганізацый) або самастойна, дадаткова прадстаўляюць праект дагавора (кантракт) паміж накіроўваючым бокам і ГДУ.

Асобы, якія здалі поўнасцю або часткова кандыдацкія экзамены, вызваляюцца ад адпаведных уступных экзаменаў і карыстаюцца пераважным правам залічэння ў аспірантуру па конкурсу.

Акрамя таго, пры роўнай колькасці балаў перавагу пры залічэнні маюць асобы, ў якіх:

— больш высокая адзнака на ўступным экзамене па спецыяльнасці;

— спіс публікацый, а таксама стаж работы па дадзенай спецыяльнасці;

— ёсць дыпломы лаўрэатаў рэспубліканскага агляду-конкурсу студэнцкіх навуковых работ і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый.

Асобы, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсу, могуць быць залічаны ў аспірантуру на кантрактнай аснове.

Асобы, залічаныя ў аспірантуру з адрывам ад вытворчасці, забяспечваюцца стыпендыяй. Іншагароднім прадстаўляецца інтэрнат.

Асобы, якія раней прайшлі поўны курс навучання ў аспірантуры, правам паўторнага навучання ў аспірантуры без аплаты за навучанне не карыстаюцца.

Уступныя экзамены праводзяцца **з 1 па 30 кастрычніка 2001 года.**

Прыём дакументаў з 28 жніўня **да 10 верасня 2001 года.**

Дакументы накіроўваць на адрас:

246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104, аддзел аспірантуры (п.4-11), тэл.57-83-77.

**РЭКТАРАТ.**

Спорт

## З КАГОРТЫ ПРАСЛАЎЛЕНЫХ

Імя выпускніцы факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта Наталлі Сазановіч сёння вядома усім аматарам лёгкай атлетыкі. Яна – адпаведна сярэбраны і бронзавы прызёр апошніх дзвюх летніх Алімпіяд па сямібор'ю, пераможца зімовага чэмпіянату свету па гэтаму віду каралевы спорту.

Новага поспеху Наталля дасягнула на нядаунім летнім чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы. З канадскага горада Эдмантана, дзе праходзілі спаборніцтвы, яна вярнулася з сярэбранай узнагародай.

Нагадаем, такой стабільнасцю вынікау, якія паказвае Н.Сазановіч, яшчэ не вызначалася ні адна сяміборка нашай планеты.

## ДВУХКРАТНЫ ЧЭМПІЁН ЕЎРОПЫ

Прыемная навіна прыйшла з венгерскага горада Дз'ёр, дзе праходзіу чарговы чэмпіянат Еуропы па пауэрліфтынгу (жым штангі лежачы) сярод ветэранау. У ім прынялі удзел каля 300 асілкау з 28 краін.

Старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту ГДУ майстар спорту Уладзімір Галавач у вагавай катэгорыі да 90 кг заваявау залаты медаль. Дарэчы, гэта другая узнагарода вышэйшай пробы Уладзіміра Аляксандравіча, якой ён удастоены на чэмпіянатах Еуропы.

Да гэтага дадам, што у нашага калегі добрыя дасягненні і на трэнерскай ніве: ён – галоуны трэнер студэнцкай каманды нашага універсітэта па пауэрліфтынгу. Каманда універсітэта шмат разоу перамагала у студэнцкіх Спартакіядах ВНУ Беларусі, на рахунку трэнера дзесятак падрыхтаваных майстроу спорту Рэспублікі Беларусь, у тым ліку і майстар спорту міжнароднага класа.

**В.МАРЧАНКА.**

## ПАДГЛЕДЗЕЎ ФОТААБ'ЕКТЫЎ




У "бой" за месца пад універсітэцкім дахам.

Фота У.Чысціка.

## ВЫКАРЫСТАЙЦЕ ЛЬГОТНЫЯ КРЭДЫТЫ

Для супрацоўнікаў і выкладчыкаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і стаяць на ўліку не менш чым па тры гады, адміністрацыя Цэнтральнага раёна прапануе пабудаваць дзвюх- (аг. пл. 54 кв. м), трох- (аг. пл. 69 кв. м) або чатырох- (аг. пл. 81 кв. м) пакаёвыя кватэры па долеваму ўдзелу праз УКБ гарвыканкама за кошт ільготных крэдытаў – 75 % і ўласных сродкаў – 25% ад кошту кватэры. Кошт 1 кв. м – 314 тыс. руб. Ільготны крэдыт будзе давацца па рашэнню адміністрацыі Цэнтральнага раёна ў парадку чаргі.

За даведкамі звяртацца ў жыллёва-бытавую камісію прафкама, тэл.: 57-79-97, 57-19-22.

**М.ФЯДОСЕНКА,**
**старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафкама ГДУ.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

**аб'яуляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:**

— аздарауленчай і лячэбнай фізкультуры — дацэнта;
— беларускай культуры — дацэнта (0,5 ставукі);
— беларускай мовы — дацэнта;
— гісторыі славян і спецыяльных гістарычных дысцыплін — дацэнта;
— давузаускай падрыхтоукі і прафарыентацыі — дацэнта;
— лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту — дацэнта;
— педагогікі — дацэнта;
— рускага, агульнага і славянскага мовазнауства — загадчыка кафедры, дацэнта (2);
— тэорыі і практыкі англійскай мовы — старшага выкладчыка (2);
— філасофіі — старшага выкладчыка;
— эканамічных тэорый — дацэнта;
— эканомікі і кіравання вытворчасцю — дацэнта.

Тэрмін падачы заяу — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроуваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 503
Падпісана да друку 28.08.2001 г.